


# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

2023

БЕЛАРУСЬ

# ЗМЕСТ:

ПРАДМОВА .... 3
АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ АГС .... 5
ПРАВАВОЕ АСЯРОДДЗЕ .... 7
АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ .... 10
ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ .... 12
АДВАКАТАВАННЕ .... 15
АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ .... 18
ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА .... 20
ГРАМАДСКІ ІМІДЖ .... 22

***Падзяка:***
*гэтая публікацыя створаная дзякуючы шчодрай падтрымцы амерыканскага народа праз Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID).*

***Дысклэймер:***
*усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, належаць экспертам і эксперткам, якія ўдзельнічалі ў ацэнцы Індэкса і падрыхтоўцы справаздачы і рэдакцыйнай калегіі і не абавязкова адлюстроўваюць пазіцыю USAID або FHI 360.*

***Фота на вокладцы:***
*Праваабарончы цэнтр “Вясна”, spring96.org. Сустрэча па надпісанні лістоў палітзняволеным у Дзень салідарнасці з беларускімі палітвязнямі 21 траўня ў Варшаве.*

# ПРАДМОВА

FHI 360 разам з партнёрамі — арганізацыяй CSO Fusion і Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці (USAID) — з задавальненнем прадстаўляе вашай увазе 24-е выданне Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС) Беларусі, у якім асвятляюцца змены ў сектары за 2023 год. Гэтая справаздача — сведчанне мужнасці і самаадданасці беларускіх грамадзянскіх актывістаў, што застаюцца ў краіне, а таксама тых, хто мусіць дзейнічаць у выгнанні. Яны працягваюць працаваць на карысць дэмакратычнай, суверэннай Беларусі, нягледзячы на бязлітасныя рэпрэсіі з боку цяперашняга ўрада. Менавіта дзякуючы іх намаганням беларуская грамадзянская супольнасць не толькі ацалела, пераадолеўшы велізарныя перашкоды, але больш за тое — прыстасавалася да новай рэчаіснасці і працуе далей для прасоўвання міру, справядлівасці і дабрабыту ў Беларусі.

Гэты Індэкс, ініцыяваны USAID больш за чвэрць стагоддзя таму, забяспечвае арганізацыі грамадзянскай супольнасці, донараў, навукоўцаў і іншых асоб найважнейшымі звесткамі датычна тэндэнцый, што ўплываюць на эфектыўнасць і жыццяздольнасць сектара АГС. На працягу многіх гадоў Індэкс адсочвае паляпшэнні і зніжэнні паказчыкаў па сямі ключавых аспектах або «параметрах» устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці: прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая устойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслуг, інфраструктура сектара і грамадскі імідж.

Метадалогія Індэкса ўстойлівасці АГС абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ўваходзяць у экспертную групу для ацэнкі згаданых параметраў устойлівасці АГС. Экспертная група ўзгадняе бал па кожным параметры ад 1 (найвышэйшы ўзровень устойлівасці) да 7 (найбольш абмежаванае развіццё ўстойлівасці). Агульны паказчык устойлівасці для сектара АГС выводзіцца шляхам асярэднення балаў па параметрах. Далей ацэнкі экспертнай групы і адпаведныя апісальныя справаздачы разглядае рэдакцыйная калегія з мэтай захавання паслядоўнасці падыходаў і стандартаў для спрашчэння міжгадавых супастаўленняў, а таксама каб упэўніцца, што апісальная справаздача падмацоўвае ацэнкі доказамі. Больш падрабязна пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання справаздач, можна даведацца *на сайце FHI 360*.

З 2010 года Індэкс устойлівасці АГС, заснаваны на той жа метадалогіі з не-вялікімі адхіленнямі, складаецца для шырокага шэрага краін усяго свету, што дазваляе адсочваць тэндэнцыі і змены ў сектарах грамадзянскай супольнасці ў даўгатэрміновай перспектыве. Хоць выданне глабальнай справаздачы Індэкса ўстойлівасці АГС за 2023 год не плануецца, FHI 360, CSO Fusion і USAID вырашылі выкарыстаць гэтую метадалогію для падрыхтоўкі справаздачы па

Беларусі. Ва ўмовах краіны з надзвычай абмежаваным доступам да надзейнай інфармацыі гэтая справаздача дае інфармацыю пра грамадскі сектар, вымушаны працаваць у незвычайна жорсткіх умовах, і была падрыхтаваная з мэтай выкарыстання беларускімі грамадскімі дзеячамі і іх міжнароднымі саюзнікамі для дасягнення лепшых вынікаў.

Такія публікацыі былі б немагчымыя без удзелу шматлікіх асоб і арганізацый. Мы асабліва ўдзячныя ўдзельнікам экспертнай групы, якія падзяліліся сваімі ўнікальнымі ведамі і экспертызай нягледзячы на рызыку пераследу. Менавіта на іх ведах, назіраннях і глыбокім аналізе грунтуецца гэты Індэкс. Акрамя таго, хочацца выказаць асаблівую падзяку CSO Fusion і беларускім экспертам, якія сталі аўтарамі справаздачы, Эрын Мак-Карці з USAID і маім калегам з FHI 360: Руце Валайціт\u044d, Юнэлі Сальнікавай і Дэвіду Ленэту. Гэтая справаздача не пабачыла б свет без іх намаганняў.

*Прыемнага чытання,*
*Сьюзан Джэй,*
*Дырэктарка праектаў па Літве, FHI 360*

# АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ АГС:

# 6.0 (2022: 6.0)




Паглыбленне крызісу ў галіне правоў чалавека, няспынныя масавыя рэпрэсіі супраць палітычнай апазіцыі, арганізацый грамадзянскай супольнасці, СМІ і розных сацыяльных груп, а таксама бягучая ваенная агрэсія Расіі супраць Украіны, якую падтрымлівае беларускі рэжым, па-ранейшаму вызначалі сітуацыю ў Беларусі ў 2023 годзе. Акрамя таго, нястомныя намаганні рэжыму падавіць любое выражэнне нязгоды стварылі атмасферу страху і няўпэўненасці.

У 2023 годзе беларускія праваабаронцы зарэгістравалі **6386 выпадкаў крымінальнага і адміністрацыйнага пераследу**. Па стане на 31 снежня 2023 года палітычнымі зняволенымі былі прызнаныя прынамсі **1452 беларусаў.** З 2020 года дадаткова каля 1000 палітвязняў выйшлі на волю ў сувязі з адбыццём тэрміну пакарання, памілаваннем або зменамі ў працэсуальных дзеяннях. Улады ўсё часцей падвяргаюць палітычных зняволеных катаванням і іншым формам жорсткага абыходжання, у тым ліку пазбаўляючы іх магчымасці камунікаваць з роднымі.

Прадстаўнікі АГС, якія дзейнічаюць у Беларусі, далей падвяргаліся затрыманням, арыштам, вобшукам, допытам і іншым фор-мам ціску і пераследу. Працягвалася масавая ліквідацыя грамадскіх арганізацый, распачатая ў 2020 годзе. Па дадзеных праваабарончай арганізацыі Lawtrend, у 2023 годзе было прынята рашэнне аб прымусовай ліквідацыі не менш як 203 арганізацый грамадзянскай супольнасці, яшчэ 133 вырашылі самараспусціцца, каб пазбегнуць пераследу і іншай рызыкі. Агулам з 2020 года беларускі **трэці сектар страціў прынамсі 1509 інстытуцыяналізаваных АГС.** Як і ў папярэднія гады, улады працягвалі шырока выкарыстоўваць заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам і тэрарызмам для падаўлення грамадзянскай актыўнасці.

Паводле розных ацэнак, з 2020 года каля **400-500 тысяч чалавек пакінулі Беларусь**, ратуючыся ад палітычнага крызісу, рэпрэсій і эканамічнай нестабільнасці. Рэжым працягвае пераследаваць тых, хто знаходзіцца ў выгнанні, у тым ліку праз увядзенне практыкі спецыяльнага справавядзення, правядзенне завочных судовых працэсаў, пераследу сваякоў актывістаў, што выехалі з Беларусі, і ўскладненне ім жыцця за мяжой. Напрыклад, з верасня 2023 года беларускія дыпламатычныя прадстаўніцтвы спынілі выдачу пашпартоў і аказанне іншых консульскіх паслуг грамадзянам Беларусі, якія пражываюць за мяжой. Беларусы, у якіх скончыўся тэрмін дзеяння пашпарта, стаяць перад выбарам: застацца за мяжой без сапраўднага дакумента (што ў многіх краінах азначае праблемы з законам) або вярнуцца дадому, дзе іх можа чакаць судовы пераслед.

**Расце разрыў паміж беларускімі АГС**, што працуюць унутры краіны і за яе межамі. АГС, якія базуюцца ў Беларусі, сутыкаюцца са значнымі абмежаваннямі і праблемамі ў сваёй працы ў параўнанні з арганізацыямі і ініцыятывамі, якія дзейнічаюць за мяжой, што прыводзіць да пастаноўкі розных для кожнай групы мэт, фарміравання розных парадкаў дня, гарызонтаў планавання і метадаў кіравання. Адначасова АГС унутры краіны маюць значна лепшы непасрэдны доступ да сваіх мэтавых груп, што з'яўляецца значнай перавагай перад арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў выгнанні.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, беларускія АГС прадэманстравалі жыццяздольнасць і гнуткасць і **працягнулі сваю дзейнасць,** спрыяючы пазітыўным зменам. Нават у гэтых нестабільных умовах многія АГС змаглі захаваць свой патэнцыял, больш эфектыўна рэарганізаваць сваю працу і знайсці новыя спосабы аказання паслуг. І ўнутры краіны, і за мяжой з'явіліся новыя АГС. Міжнародная салідарнасць і падтрымка заставаліся важнымі фактарамі падтрымання жыццядзейнасці беларускай грамадзянскай супольнасці.

Па дадзеных праваабарончай арганізацыі Lawtrend, па стане на 31 снежня 2023 года ў Беларусі было зарэгістравана каля 2330 АГС трох арганізацыйна-прававых форм: 1761 грамадскае аб'яднанне, 118 фондаў і 451 няўрадавая ўстанова. З іх 675 з'яўляюцца арганізацыямі спартыўнага і танцавальнага кірунку, а 374 арганізацыі працуюць у галіне сацыяльнай дапамогі, дабрачын-

насці і аховы здароўя. У перыяд з 2021 па 2023 год у Беларусі было зарэгістравана ўсяго 156 новых некамерцыйных арганізацый; дзейнасць большасці з іх звязаная са спортам, дабрачыннасцю, адукацыяй або аховай навакольнага асяроддзя. Працэдуры ліквідацыі ў дачыненні да гэтых арганізацый пакуль не пачыналіся.

Важна таксама адзначыць, што ў 2023 годзе ўмовы для збору і праверкі звестак аб АГС, якія працуюць у Беларусі, значна пагоршыліся. Большая частка інфармацыі пра стан сектара паступае з даследаванняў і ацэнак, якія праводзяцца арганізацыямі, што працуюць за мяжой. Агульнадаступныя дадзеныя аб дзейнасці грамадскіх арганізацый у Беларусі абмежаваныя, а эксперты, якія пражываюць у Беларусі, часта ўстрымліваюцца ад удзелу ў даследаваннях і апытаннях праз клопат за сваю бяспеку.

# ПРАВАВОЕ АСЯРОДДЗЕ: 7.0 (2022: 7.0)




У 2023 годзе прававое асяроддзе для беларускіх АГС нязначна пагоршылася. Аднак, паколькі ацэнка за папярэднія гады ўпала да найгоршай з магчымых, у адпаведнасці з метадалогіяй Індэкса ўстойлівасці АГС з 2021 года яна застаецца нязменнай.

**Працягваліся масавыя рэпрэсіі супраць АГС і актывістаў грамадзянскай супольнасці.** АГС сутыкаліся з рознымі формамі пераследу і ціску, у тым ліку гвалтоўнымі вобшукамі, праверкамі, прыпыненнем дзейнасці, блакаваннем вэб-сайтаў АГС, адміністрацыйнымі і крымінальнымі абвінавачваннямі, допытамі супрацоўнікаў і валанцёраў АГС, а таксама ціскам на сваякоў і блізкіх людзей, звязаных з АГС. У 2023 годзе Міністэрства юстыцыі правяло праверкі

больш за 1000 грамадскіх аб'яднанняў і вынесла пісьмовыя папярэджанні 410 зарэгістраваным АГС, галоўным чынам выкліканыя нязначнымі пытаннямі, такімі як парушэнні працэдур вядзення ўліку і тэрмінаў прадстаўлення справаздачнасці. Такія папярэджанні могуць быць выкарыстаны як падстава для пазнейшай прымусовай ліквідацыі. Сяброўства некаторых асоб у арганізацыях было прымусова прыпыненае праз пагрозы ліквідацыі гэтых арганізацый у выпадку адмовы кіраўніцтва выканаць патрабаванне. Напрыклад, палітвязня Алеся Пушкіна (за некалькі тыдняў да яго смерці ў турме) і дзевяць іншых сябраў Беларускага саюза мастакоў прымусова выключылі з арганізацыі.

Дзяржаўная кампанія ліквідацыі АГС, якая пачалася ў сярэдзіне 2021 года, працягвалася і ў 2023 годзе. Хоць колькасць ліквідаваных АГС у 2023 годзе нязначна скарацілася ў параўнанні з 2021 і 2022 гадамі, гэта адбылося ў першую чаргу з-за таго, што лічба арганізацый, якія падлягаюць ліквідацыі, скарацілася ў выніку масавай ліквідацыі ў папярэднія гады. З моманту правядзення выбараў у 2020 годзе Беларусь страціла прынамсі 1509 інстытуцыяналізаваных АГС, з якіх не менш за 203 былі ліквідаваныя, а яшчэ 133 самаліквідаваліся ў 2023 годзе.

Толькі некалькі новых ініцыятыў, у тым ліку раней ліквідаваныя АГС, паспрабавалі прайсці афіцыйную рэгістрацыю. У асобных выпадках рэгістрацыя новых АГС ажыццяўлялася пад непасрэдным кантролем або згодна з наказамі ўладаў. Міністэрства юстыцыі не публікуе колькасных дадзеных аб рэгістрацыі грамадскіх арганізацый за 2023 год. Паводле незалежных звестак, сабраных арганізацыяй Lawtrend, цягам года было зарэгістравана па меншай меры 13 няўрадавых арганізацый, 3 фонды і 17 грамадскіх аб'яднанняў. Некаторыя ініцыятывы рэгістраваліся і дзейнічалі як камерцыйныя арганізацыі або індывідуальныя прадпрымальнікі, але такі прававы статус не абараніў іх ад пераследу і рэпрэсій з боку ўрада.

З 2023 года рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні абавязаны ствараць рэгіянальныя аддзяленні ў Мінску і ўсіх абласцях Беларусі, кожнае з якіх мусіць мець юрыдычны адрас у нежылым памяшканні. Незалежныя арганізацыі з абмежаванымі рэсурсамі наўрад ці здольныя выканаць гэтае патрабаванне. Таксама ў 2023 годзе была прынятая новая рэдакцыя Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», якая ўступіць у сілу 6 ліпеня 2024 года. Новы закон робіць больш жорсткімі патрабаванні і працэдуры рэгістрацыі рэлігійных арганізацый і абавязвае іх праходзіць перарэгістрацыю. У 2023 годзе дзяржава аказвала значны ціск на святароў, у тым ліку высунуўшы супраць некаторых з іх крымінальныя абвінавачванні. Напрыклад, была ліквідаваная рэлігійная абшчына царквы хрысціян поўнага Евангелля «Новае жыццё», а яе інтэрнэт-рэсурсы былі прызнаныя «экстрэмісцкімі». Палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні і рэлігійныя арганізацыі былі абавязаны забяспечваць выкананне асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, нібыта для змякчэння пагроз нацыянальнай бяспекі, у адваротным выпадку ім можа пагражаць ліквідацыя.

Працягвалася практыка «ўзнаўлення» грамадзянскай супольнасці за кошт «няўрадавых» арганізацый, створаных дзяржавай. 14 лютага 2023 года Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» ўсталяваў іерархію АГС, заснаваную на ўзроўні іх узаемадзеяння з дзяржавай, стварыўшы асабліва спрыяльныя ўмовы для пяці арганізацый: Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Беларускага саюза жанчын і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Улады падтрымлівалі дзейнасць некаторых звязаных з дзяржавай арганізацый, адначасова пераследуючы незалежныя АГС. Працягвалася практыка дыскрэдытацыі незалежных АГС у праўладных СМІ.

**Дзяржава таксама працягвала душыць грамадзянскую актыўнасць, выкарыстоўваючы заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму і тэрарызму.** У 2023 годзе значна ўзрасла колькасць крымінальных спраў, звязаных са стварэннем «экстрэмісцкіх фарміраванняў» і ўдзелам у іх. Практыка прызнання АГС «экстрэмісцкімі фармаваннямі» пашырылася: такімі абвяшчаліся нават раней ліквідаваныя АГС, такія як Беларуская асацыяцыя журналістаў, SYMPA, Задзіночанне беларускіх студэнтаў і Праваабарончы цэнтр «Вясна».

**Больш за сто прадстаўнікоў АГС адбывалі турэмныя тэрміны** па розных сфабрыкаваных абвінавачваннях, звязаных з «экстрэмісцкай дзейнасцю», заклікамі да санкцый, арганізацыяй і фінансаваннем дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак, і іншымі. Некаторых з іх дадалі да спісу асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай і (або) тэрарыстычнай дзейнасці. У 2023 годзе арт-менеджар Павел Белавус, заснавальнік прасторы «Арт-Сядзіба» і інтэрнэт-крамы сувеніраў этнічнай тэматыкі Symbal.by, быў асуджаны на 13 гадоў калоніі строгага рэжыму. Праваабаронцу і лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру Алеся Бяляцкага асудзілі на 10 гадоў турэмнага зняволення, а яго калег з «Вясны» Валянціна Стэфановіча і Уладзіміра Лабковіча — да 9 і 7 гадоў адпаведна. Паліталагіня і рэдактарка аналітычнага сайта «Наше мнение» Валерыя Касцюгова і сузаснавальніца SYMPA і экспертка BIPART Таццяна Кузіна былі асуджаныя на 10 гадоў турэмнага зняволення кожная.

Рэпрэсіі закранулі і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, якія мусілі пакінуць краіну. У дачыненні да іх прымяняліся палажэнні крымінальнага заканадаўства аб спецыяльным (завочным) судаводстве, па месцы іх рэгістрацыі праводзіліся вобшукі, а на маёмасць накладаўся арышт. Указам №278 «Аб парадку выдачы дакументаў і здзяйснення дзеянняў» была адменена магчымасць падаўжэння тэрміну дзеяння пашпарта грамадзяніна Беларусі за межамі Беларусі, што выклікала шматлікія цяжкасці пры легалізацыі пражывання беларусаў за мяжой.

**АГС, якія застаюцца ў Беларусі, да нацыянальнага і замежнага фінансавання значна пагоршыўся.** Агульная атмасфера страху і шматлікія крымінальныя справы ў сувязі з ахвяраваннямі ў фонды салідарнасці дэматывавалі людзей ахвяраваць на карысць АГС. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці

могуць афіцыйна атрымліваць замежную дапамогу толькі на абмежаваны спіс дапушчальных мэт, у які не ўваходзяць правы чалавека, гендэрная роўнасць і многія іншыя кірункі дзейнасці АГС. Акрамя таго, АГС мусяць рэгістраваць дапамогу ў дзяржаўных органах. Адначасова дзяржава ўхваліла змены ў Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», якія дазваляюць АГС, у тым ліку незарэгістраваным, атрымліваць фінансаванне з мясцовага бюджэту. Такое заканадаўства з'яўляецца прагрэсіўным крокам, аднак ва ўмовах масавых рэпрэсій, адсутнасці свабоднага доступу да інфармацыі, ліквідацыі АГС, пераследу за актыўную дзейнасць і крымінальнай адказнасці за арганізацыю і ўдзел у незарэгістраваных арганізацыях яно спараджае злоўжыванні і дыскрымінацыю больш незалежных ініцыятыў, бо падтрымка аказваецца толькі тым, хто лаяльны да ўладаў.

У выпадку калі АГС зарэгістраваныя як фонды або ўстановы, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, даход ад такой дзейнасці падлягае падаткаабкладанню па тых жа стаўках, што і даход любой камерцыйнай арганізацыі.

Доступ АГС да юрыдычнай дапамогі быў абцяжараны вымушаным пераездам за мяжу арганізацый, якія традыцыйна аказвалі юрыдычныя паслугі арганізацыям грамадзянскай супольнасці на бязвыплатнай аснове, а таксама пераследам беларускіх адвакатаў, якія прадстаўляюць АГС. Арганізацыям, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у выгнанні, патрабуецца юрыдычная падтрымка не толькі па пытаннях беларускага заканадаўства, але і па пытаннях, звязаных са стварэннем і дзейнасцю юрыдычных асоб у краінах рэлакацыі.

# АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ:

## 5.3 (2022: 5.3)



У 2023 годзе беларускія АГС змаглі захаваць свой арганізацыйны патэнцыял на ўзроўні 2022 года. Становішча АГС, якія працуюць у Беларусі, і АГС, якія дзейнічаюць у выгнанні, істотна адрознівалася.

Абедзве групы арганізацый прыстасаваліся да новых умоў і **пачалі планаваць сваю дзейнасць на больш працяглы тэрмін**. Аднак не ўсе АГС разумеюць адрозненне паміж стратэгічным, тактычным і аператыўным планаваннем. Планаванне і кіраванне, арыентаваныя на выніку, па-ранейшаму заставаліся для іх складанай задачай. Хоць некаторыя АГС перагледзелі свае місіі ў 2023 годзе, большасць з іх працягнулі працаваць на карысць Беларусі. Паводле даследавання дзейнасці АГС у краінах рэлакацыі, праведзенага ОЕЕС і Lawtrend, 89% рэспандэнтаў адзначылі, што дзейнасць іх АГС арыентаваная на мэтавыя групы, якія знаходзяцца ў Беларусі. Адначасова ў параўнанні з аналагічным даследаваннем, праведзеным у 2022 годзе, нязначна павялічылася доля АГС, якія арыентуюцца ў сваёй дзейнасці на беларускую дыяспару.

Большасць АГС ацэньваюць поспех сваёй працы на ўзроўні асобных праектаў, надаючы больш увагі кароткатэрміновым вынікам, такім як ахоп аўдыторыі, колькасць праведзеных мерапрыемстваў і аказаных паслуг, а не ўплыву іх працы на мэтавыя групы. Ацэнка праграм і агульнай эфектыўнасці дзейнасці АГС, а таксама правядзенне рэгулярнай арганізацыйнай дыягностыкі пакуль не сталі звычайнай практыкай сярод АГС.

Паводле даследавання «Арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі напачатку 2023 года: Стан, сувязі, патрэбы», праведзенага Цэнтрам новых ідэй сумесна з Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі, шмат АГС сутыкнуліся з цяжкасцямі, намагаючыся працягнуць сваю дзейнасць, але ў большасці выпадкаў яны здолелі знайсці рэсурсы для іх пераадолення: праводзілі сустрэчы па стратэгічным планаванні, звярталіся за парадамі да кансультантаў і распрацоўвалі надзейныя ўнутраныя палітыкі і працэдуры.

Што да структуры кіравання АГС, важна адзначыць, што сяброўскія арганізацыі, якія займаюцца правамі асоб з інваліднасцю, працай з моладдзю, аховай навакольнага асяроддзя і іншымі пытаннямі, галоўным чынам засталіся ў Беларусі. Арганізацыям, якія папярэдне былі сяброўскімі, не ўдалося аднавіць сваю сяброўскую структуру пасля пераезду за мяжу. Большасць беларускіх АГС за мяжой былі зарэгістраваныя адным-трыма заснавальнікамі, якія адначасова выступаюць супрацоўнікамі арганізацыі. У такіх арганізацыях няма выразнага падзелу абавязкаў паміж праўленнем і супрацоўнікамі. У многіх АГС кіруючыя органы часта носяць сімвалічны характар.

У 2023 годзе АГС і іх прадстаўнікі далей пераязджалі з Беларусі. Як і раней, прадстаўнікі АГС, якія працягвалі сваю працу ўнутры краіны, заставаліся ў надзвычай рызыкоўных умовах, сутыкаліся з ціскам і пагрозамі пераследу і галоўным чынам не мелі стабільнага даходу. Вынікі даследавання, праведзенага Цэнтрам новых ідэй і Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі, паказваюць, што **бяспека, псіхічная ўстойлівасць і праблемы са здароўем чальцоў каманды**

**былі найбольш распаўсюджанымі цяжкасцямі, з якімі сутыкаліся беларускія АГС унутры краіны**. Арганізацыі не змаглі вырашыць гэтыя праблемы самастойна: «Большасць незадаволеных патрэб беларускіх АГС сёння звязаныя з працай каманды. Перш за ўсё, неабходна забяспечыць асабістую бяспеку супрацоўнікаў і валанцёраў, улічваючы цяперашні ўзровень рэпрэсій у краіне, і пераадолець псіхалагічныя (а часам і фізічныя) наступствы працы ў гэтых траўматычных умовах». У іншых даследаваннях грамадзянскія актывісты паведамлялі аб дрэнным псіхалагічным і фізічным стане, што прывяло да зніжэння матывацыі і якасці іх працы і змусіла актывістаў пакінуць сектар. Усе гэтыя фактары спрычыніліся да недахопу кваліфікаваных кадраў у АГС, у тым ліку топ-менеджэраў, фінансавых спецыялістаў і фандрэйзераў.

Тэхнічны прагрэс АГС у 2023 годзе практычна не змяніўся. Актывісты і супрацоўнікі АГС у краіне па-ранейшаму сутыкаліся з канфіскацыяй абсталявання падчас вобшукаў па месцы жыхарства або ў офісах, доступ да некаторых відаў праграмнага забеспячэння і інструментальных сродкаў IT ускладніўся ў выніку міжнародных санкцый супраць Беларусі і абмежаванняў, накладзеных на фінансавыя пераводы з беларускіх банкаўскіх рахункаў. Адначасова многія АГС дамагліся прагрэсу ў забеспячэнні сваёй лічбавай бяспекі і набыцці лічбавых інструментаў, а некаторыя арганізацыі і ініцыятывы пачалі ўкараняць у сваю працу інструменты, заснаваныя на штучным інтэлекце.

# ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ:

## 6.7 (2022: 6.7)



**Фінансавая ўстойлівасць беларускіх АГС па-ранейшаму была ў значнай ступені падарваная працяглымі праблемамі з атрыманнем і выкарыстаннем нацыянальнага і замежнага фінансавання ў Беларусі.** Значна вырасла колькасць выпадкаў крымінальнага пераследу асоб за ахвяраванні на карысць АГС, што кваліфікавалася ўладамі як фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці. Разам з гэтымі праблемамі і палітычна матываваным няроўным доступам АГС да замежнага фінансавання, роля нацыянальнага фінансавання для АГС, якія базуюцца ў Беларусі, нязначна ўзрасла, хоць і застаецца недастатковай для задавальнення патрэбаў сектара.

Для АГС, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі, доступ да міжнароднага фінансавання паменьшыўся, галоўным чынам праз надзвычай жорсткія абмежаванні на атрыманне замежных сродкаў для некамерцыйнай дзейнасці. У сакавіку 2023 года лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі і яго калегі з Праваабарончага цэнтра «Вясна» былі асуджаныя на доўгія тэрміны турэмнага зняволення па артыкула Крымінальнага кодэкса, звязаных з кантрабандай і фінансаваннем групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак. Многія арганізацыі сталі асцерагацца замежнага фінансавання праз гэты і іншыя выпадкі крымінальнага пераследу лідараў і актывістаў грамадскіх арганізацый.

Адначасова **нарастаў пераслед асоб за ахвяраванні праваабарончым арганізацыям або на карысць ахвяр рэпрэсій**. У 2023 годзе сотні людзей былі вымушаныя «кампенсаваць» свае ахвяраванні шляхам пераводу грошай дзяржаўным або звязаным з урадам грамадскім арганізацыям (напрыклад, бальніцы або дзіцячыя дамы). Гэтыя прымусовыя пераводы перавышалі суму першапачатковага ахвяравання ў дзесяць і больш разоў. Некаторыя ахвяраванні былі пералічаныя яшчэ ў 2020 годзе. Асобам, што адмаўляліся выконваць гэтыя патрабаванні, пагражалі крымінальным пераследам і доўгім турэмным зняволеннем. Дакладная колькасць людзей, якія сутыкнуліся з такім вымагальніцтвам, невядомая, але да канца 2023 года прынамсі 66 чалавек былі асуджаныя на турэмнае зняволенне за зробленыя ахвяраванні.

**Некаторыя замежныя донары скарацілі фінансаванне беларускай грамадзянскай супольнасці.** Асобныя фонды і праграмы цалкам спынілі падтрымку дэмакратыі і развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, сцвярджаючы, што такая дзейнасць немагчымая ў цяперашніх умовах. Па аперацыйных прычынах і прычынах, звязаных з бяспекай, іншыя донары мусілі засяродзіцца на падтрымцы АГС, якія дзейнічаюць з-за мяжы. Акрамя таго, існуюць донары, якія прапануюць невялікія гранты для падтрымання грамадзянскай актыўнасці ў Беларусі.

Разам з абмежаваннямі замежнага фінансавання, урад стварыў новыя механізмы дзяржаўнага фінансавання нізавой актыўнасці. Артыкулам 36-1 Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» устаноўлены конкурсны механізм атрымання мясцовымі ініцыятывамі дзяржаўна

га фінансавання ў фармаце, аналагічным бюджэтам удзелу, у рамках якога мясцовая супольнасць можа атрымліваць сродкі для вырашэння пытанняў мясцовага значэння. Гэты закон, а таксама папраўкі да Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», якія тычацца фінансавання маладзёжных ініцыятыў, дазваляюць выдзяляць дзяржаўнае фінансаванне незарэгістраваным ініцыятывам, якія раней не мелі права на атрыманне такіх сродкаў. У дзяржаўным бюджэце на 2024 год прадугледжана 650 000 даляраў ЗША на падтрымку мясцовых грамадзянскіх ініцыятыў. Першыя гранты ў межах гэтай працэдуры былі выдзеленыя восенню 2023 года. Акрамя таго, у канцы 2023 года праўрадавае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» рэалізавала праграму малых грантаў.

Гэта дзяржаўнае фінансаванне, хутчэй за ўсё, пойдзе на карысць толькі праўладным або звязаным з мясцовымі ўладамі групам грамадзян. Раней ліквідаваныя незалежныя АГС асцерагаюцца звяртацца за такім фінансаваннем, баючыся ўзмацнення пераследу, паколькі ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі быў крыміналізаваны ў 2021 годзе.

Нягледзячы на змены, унесеныя ў Закон «Аб сацыяльных паслугах» у снежні 2023 года, сістэма дзяржаўнай сацыяльнай замовы не зведала істотных змен. Як і раней, гэтыя сродкі былі даступныя толькі вузкаму колу арганізацый у пэўных сферах дзейнасці. Прамое дзяржаўнае фінансаванне атрымліваюць толькі некалькі арганізацый, найбольш лаяльных да ўладаў. **У 2023 годзе фінансаванне гэтых ГОНГА павялічылася.**

Паводле даследавання дзейнасці грамадскіх арганізацый у краінах рэлакцыі, праведзенага OEEC і Lawtrend, 36,4% арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія ўдзельнічалі ў апытанні, адзначылі, што аб'ём іх фінансавання скараціўся пасля вымушанага пераезду за мяжу, 29,1% сказалі, што аб'ём фінансавання застаўся ранейшым, а 23,6% заявілі, што іх фінансаванне павялічылася. Многія АГС, якія адзначылі агульнае павелічэнне аб'ёму фінансавання, паведамілі, што доля іх адміністрацыйных выдаткаў вырасла, што, у сваю чаргу, прывяло да памяншэння аб'ёму фінансавання праграмнай дзейнасці. Падаткаплацельшчыкі ў Літве і Польшчы маюць права пералічваць частку падаходнага падатку (1,2% і 1,5% адпаведна) некамерцыйным арганізацыям. Беларускія АГС, за-рэгістраваныя ў гэтых краінах, скарысталіся такой магчымасцю, аднак гэтая крыніца фінансавання пакуль застаецца нязначнай.

Супярэчлівыя тэндэнцыі назіраюцца ў галіне сацыяльнага прадпрымальніцтва і фінансавання грамадскіх арганізацый за кошт аказання паслуг. З аднаго боку, скарачэнне доступу да замежнага фінансавання падштурхоўвае АГС у Беларусі да сацыяльнага прадпрымальніцтва і аднаўлення сваёй дзейнасці ў якасці камерцыйных арганізацый або індывідуальных прадпрымальнікаў. З іншага боку, прадпрымальніцкая сфера знаходзіцца пад уплывам дзяржаўнай палітыкі рэгулявання, якая ўключае ў сябе ліцэнзаванне і абавязковыя патрабаванні да акрэдытацыі. Напрыклад, у 2023 годзе патрабаванне прайсці

пераакрэдытацыю закранула арганізацыі, якія займаюцца правядзеннем культурна-масавых мерапрыемстваў, заняткаў фізічнай культурай і спортам, а так сама некаторыя аспекты аказання сацыяльных паслуг. У сувязі з патрабаваннямі прайсці пераакрэдытацыю культурніцкія АГС, што займаюцца арганізацыяй канцэртаў або іншых культурных мерапрыемстваў унутры краіны, вымушаныя супрацоўнічаць з дзяржаўнымі ўстановамі або буйнымі камерцыйнымі арганізацыямі, каб праводзіць такія мерапрыемствы ў адпаведнасці з законам. Хоць кожная з вымаганых акрэдытацый непасрэдна закранае абмежаваную колькасць актывістаў і АГС, якія працуюць у пэўных галінах, у сукупнасці яны ўскладняюць доступ АГС да прадпрымальніцкай дзейнасці.

Што да фінансавага кіравання АГС, сітуацыя застаецца нязменнай і характарызуецца двума супрацьлеглымі практыкамі. Адна практыка ўяўляе сабой ажыццяўленне фінансавага кіравання ў адпаведнасці са строгімі патрабаваннямі беларускага заканадаўства. Другая практыка выкарыстоўваецца АГС, якія дзейнічаюць таемна і не могуць бяспечна ўжываць належныя метады кіравання фінансамі, якія прымяняюцца ў больш дэмакратычных умовах. Стандартныя працэдуры, якія забяспечваюць празрыстасць і падсправаздачнасць, такія як падзел абавязкаў і дэталёвыя аўдыты, могуць выкарыстоўвацца ўладамі для пераследу прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. АГС у выгнанні маюць больш магчымасцей укараняць прынамсі некаторыя эфектыўныя метады кіравання фінансамі, хоць такія намаганні таксама спалучаныя з рызыкамі для бяспекі, асабліва для супрацоўнікаў або партнёраў, якія пражываюць у Беларусі.

# АДВАКАТАВАННЕ:
# 6.2 (2022: 6.1)



Ва ўмовах амаль таталітарнай дыктатуры, якой зараз з'яўляецца Беларусь, **адвакатаванне як від дзейнасці практычна немагчымае**. У небяспечных умовах ліквідацыі АГС і рэпрэсій супраць іх прадстаўнікоў адвакатыўная дзейнасць, накіраваная на ўплыў на прыняцце рашэнняў у дзяржаўных органах, у Беларусі практычна спынілася, за выключэннем некаторых сціплых намаганняў на мясцовым узроўні. Але было б некарэктна казаць, што адвакатаванне адсутнічае ўвогуле. Актывісты, якія працягваюць працаваць у Беларусі, па-ранейшаму робяць пэўныя адвакатыўныя высілкі. Хоць грамадзянская супольнасць у асноўным лічыць нападкі на ўлады непрадуктыўнымі, АГС у выгнанні актыўна ўдзельнічаюць у міжнародным адвакатаванні і працуюць над фарміраваннем грамадскай думкі (як унутры краіны, так і за яе межамі, наколькі гэта магчыма).

З цягам часу, адвакатыўная праца скарачаецца. Колькасць калектыўных зваротаў, створаных праз платформу Petitions.by, з кожным годам значна скарачаецца. У 2021 годзе такіх зваротаў было 400, у 2022-м — менш за 370, а ў 2023-м — усяго каля 200. Адвакатаванне таксама ўскладнілася праз няспынныя «чысткі» грамадскіх саветаў пры дзяржаўных органах, апошні выпадак якіх прыйшоўся на вясну 2023 года. Многія з тых нешматлікіх прадстаўнікоў АГС, якія заставаліся чальцамі гэтых саветаў, былі з іх выключаныя.

**Адвакатыўная дзейнасць у Беларусі зводзілася да працы асобных актывістаў**, якія выступаюць за вырашэнне мясцовых праблем. Гэтыя намаганні ажыццяўляліся ў форме індывідуальных або калектыўных зваротаў грамадзян да чыноўнікаў па розных жыллёва-камунальных пытаннях. У больш шырокім сэнсе такія праблемы можна вызначыць як экалагічныя, гарадскія і сацыяльныя.

АГС і актывісты асабліва **не рэкламавалі выпадкі мікраадвакатавання**. Наадварот, яны імкнуліся не ствараць кааліцый і абмежаваць распаўсюд інфармацыі, каб не прыцягваць непатрэбнай увагі з боку рэпрэсіўных органаў. Па той жа прычыне інфармацыя распаўсюджвалася толькі сярод некалькіх соцень годных даверу людзей праз закрытыя тэматычныя чаты або супольнасці. Гэты фармат можна назваць падпольным адвакатаваннем. Аднак, калі грамадзянская актыўнасць сыходзіць у падполле, магчымасці яе росту становяцца крытычна абмежаванымі. У сувязі з гэтым, гэтыя намаганні таксама пацярпелі ад недахопу мясцовых лідэраў, паколькі актывісты, якія ініцыявалі такія мерапрыемствы на мясцовым узроўні, рабілі ўсё магчымае, каб заставацца ў цені ды пазбягаць любых асацыяцый з рухам дваровых супольнасцей 2020 года, паколькі яны падвяргаліся пастаянным рэпрэсіям, а найбольш вядомыя лідэры гэтага руху былі пакараныя.

У 2023 годзе **актывізаваліся прапагандысцкія намаганні неліберальных, афіляваных з дзяржавай АГС і фіктыўных НДА**, якія імітавалі грамадскую падтрымку дзяржаўных ініцыятыў. Напрыклад, летам 2023 года Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы «Штаба патрыятычных сіл Беларусі» (парасонавай структуры, якая аб'ядноўвае лідараў найбуйнейшых грамадскіх

арганізацый, праўрадавых партый і падкантрольных дзяржаве прафсаюзаў) запусціў кампанію па зборы сродкаў на будаўніцтва патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці. Кіраўнік саюза моладзі падкрэсліў, што, нібыта, «такую ініцыятыву падтрымліваюць не асобныя арганізацыі або грамадзяне, а ўся беларуская грамадскасць».

У 2023 годзе **Беларусь працягнула практыку выхаду з міжнародных канвенцый**, тым самым абмяжоўваючы магчымасці для міжнароднай адвакацыі. У прыватнасці, у жніўні Беларусь выйшла з Бернскай канвенцыі аб захаванні дзікай фаўны і флоры 1979 года, да якой краіна далучылася ў 2013 годзе. Гэты выхад адбыўся пасля таго, як Камітэт міністраў Савета Еўропы прыняў рашэнне аб забароне Беларусі вылучаць сваіх кандыдатаў на выбарныя пасады ў органах Канвэнцыі. Акрамя таго, у лістападзе Беларусь прыпыніла свой удзел у Еўрапейскай культурнай канвенцыі 1954 года. Характэрна, што абедзве канвенцыі былі прынятыя задоўга да палітычнага крызісу 2020 года ў Беларусі, і іх сутнасць не мае ніякага дачынення да бягучай палітычнай сітуацыі. Аднак пануючая пазіцыя Мінска і Еўропы заключаецца ў тым, што ўдзел Беларусі ў падобных міжнародных структурах супрацоўніцтва больш немагчымы.

Нягледзячы на гэтыя падзеі, **беларускія АГС у выгнанні працягвалі займацца міжнародным адвакатаваннем**. Напрыклад, Беларускі Хельсінкскі камітэт апублікаваў і распаўсюдзіў Беларускі індэкс правоў чалавека сярод міжнародных партнёраў, а таксама падрыхтаваў дзевяць дакладаў і шэсць афіцыйных заяў у рамках спецыяльных працэдур ААН. Да таго ж, кааліцыя праваабарончых арганізацый падрыхтавала даклад у рамках нядаўна запушчанага Маскоўскага механізму Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

Актыўна працавала Кантактная група Савета Еўропы па Беларусі, якая складаецца з прадстаўнікоў АГС і дэмакратычных палітычных структур. Дзякуючы адвакатыўным намаганням гэтай групы 1 лютага 2023 года Савет Еўропы разгарнуў план дзеянняў з 15 пунктаў па падтрымцы беларускіх дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці. У межах гэтага плана беларускія АГС у выгнанні, галоўным чынам члены Кантактнай групы, выступалі асноўнымі партнёрамі-выканаўцамі плана.

У чэрвені ў Брусэлі была створана Кансультатыўная група Беларусь-ЕС, у працы якой прынялі ўдзел прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, незалежных СМІ, праваабарончых арганізацый, бізнес-асацыяцый і палітычныя лідары. Такім чынам быў усталяваны прамы канал сувязі з Еўрапейскай камісіяй. Акрамя таго, у снежні была запушчана Ініцыятыва стратэгічнага дыялогу паміж урадам Злучаных Штатаў Амерыкі і беларускім дэмакратычным рухам і грамадзянскай супольнасцю.

# АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.5 (2022: 5.5)




Нягледзячы на шматлікія праблемы, з якімі сутыкаецца грамадзянская супольнасць Беларусі, і паступовае звужэнне ахопу мэтавых груп унутры краіны, **актыўным АГС ўнутры краіны і за мяжой удаецца падтрымліваць разнастайнасць і якасць паслуг,** дзякуючы няспыннаму пошуку новых спосабаў узаемадзеяння з мэтавымі групамі, адаптыўнасыці і выкарыстанню лічбавых інструментаў.

Адначасова няспынная хваля ліквідацыі грамадскіх арганізацый у Беларусі прывяла да далейшага скарачэння колькасці і маштабу паслуг, якія аказваюцца мэтавым групам унутры краіны. І арганізацыі, якія не страцілі рэгістрацыю, і АГС, што былі ліквідаваныя, цяпер дзейнічаюць вельмі асцярожна, не асвятлячы сваю дзейнасць публічна, і падвяргаюць сябе самацэнзуры з-за боязі пераследу. Некаторыя з паслуг, якія раней прапаноўвалі незалежныя АГС, цяпер аказваюцца ГОНГА.

Ліквідацыя і рэлакацыя АГС, прызнанне іх экстрэмісцкімі фармаваннямі, блакаванне доступу да вэб-сайтаў арганізацый і некаторых СМІ на тэрыторыі Беларусі, а таксама рэпрэсіі ў дачыненні да атрымальнікаў паслуг далей замінялі АГС узаемадзейнічаць са сваімі мэтавымі групамі. У межах даследавання «Арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі напачатку 2023 года: стан, сувязі, патрэбы», праведзенага Цэнтрам новых ідэй сумесна з Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі, 76% рэспандэнтаў паведамілі, што іх АГС сутыкнуліся з перашкодамі ва ўзаемадзеянні з мэтавымі групамі. Акрамя таго, 68% адзначылі рост колькасці прадстаўнікоў мэтавых груп, якія баяцца кантактаваць з АГС.

У гэтай складанай сітуацыі **АГС абапіраюцца на стварэнне нефармаль-**

**ных сетак і асабістыя кантакты з мэтавымі групамі, а таксама на розныя лічбавыя інструменты для ўзаемадзеяння з атрымальнікамі паслуг.** Адначасова варта адзначыць, што некаторыя кліенты, асабліва прадстаўнікі ўразлівых груп, часам недастаткова тэхналагічна адукаваныя, каб атрымліваць інфармацыю аб паслугах АГС праз VPN або ўдзельнічаць у мерапрыемствах праз анлайн-платформы.

Тым не менш, беларускія АГС актыўна аказваюць шырокі спектр паслуг у сферах грамадзянскай адукацыі, развіцця грамадзянскай супольнасці, падтрымкі ахвяр рэпрэсій і іх сем'яў, лічбавай бяспекі, развіцця культуры і нацыянальнай ідэнтычнасці, сацыяльнай дапамогі, аховы навакольнага асяроддзя і іншых. **У 2023 годзе ў выгнанні былі створаныя новыя АГС, якія прапануюць паслугі і адстойваюць інтарэсы канкрэтных мэтавых груп.** Найбольш прыкметнымі з іх з'яўляюцца Асацыяцыя палітвязняў Беларусі, Асацыяцыя беларускіх ве-тэранаў вайны ва Украіне, Беларускі інстытут тэатру і Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека.

Як і раней, многія паслугі аказваюцца дыстанцыйна, у **анлайн-фармаце**. Большасць беларускіх АГС, якія часова пераключылі сваю ўвагу на аказанне дапамогі, звязанай з поўнамаштабным уварваннем Расіі ва Украіну ў 2022 годзе, вярнуліся да сваёй звычайнай дзейнасці, скіраванай на Беларусь.

З-за пагаршэння доступу да мэтавых груп АГС рэгулярна праводзілі ацэнку патрэб сваіх кліентаў з дапамогай анлайн-апытанняў, інтэрв'ю і фокус-груп. У 2023 годзе АГС пачалі часцей прыцягваць сацыёлагаў і іншых спецыялістаў да правядзення даследаванняў сваіх мэтавых груп.

Намагаючыся захаваць бяспеку сваёй каманды і кліентаў, АГС часта верыфікуюць патэнцыйных удзельнікаў мерапрыемстваў праз прадстаўнікоў іншых арганізацый. Такая практыка **часта прыводзіць да выключэння новых актывістаў,** якія толькі далучыліся да сектара і пакуль не маюць дастаткова шырокага кола знаёмых, каб атрымаць рэкамендацыю ад іх.

Пераважная большасць АГС аказвае паслугі пры падтрымцы міжнародных донараў, але ў 2023 годзе было больш спроб часткова пакрыць выдаткі на аказанне паслуг за кошт уввядзення аплаты за ўдзел або патрабавання ад удзельнікаў афлайн-мерапрыемстваў узяць на сябе пэўныя выдаткі, напрыклад, праезд.

Урад, у сваю чаргу, прызнаваў каштоўнасць паслуг, прапанаваных выключна сацыяльна арыентаванымі АГС і ГОНГА. Выкарыстанне падкантрольнага дзяржаве механізма сацыяльнай замовы практыкавалася ў сферы аховы здароўя і сацыяльнай абароны, але ў вельмі абмежаванай форме. Раней распачатая рэжымам мэтанакіраваная кампанія па дыскрэдытацыі АГС і іх дзейнасці працягвалася і ў 2023 годзе.

# ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА:

# 5.5 (2022: 5.5)




Інфраструктура, якая падтрымлівае беларускі сектар АГС, у 2023 годзе практычна не змянілася. Аднак сітуацыя з падтрымкай і навучаннем АГС, а таксама супрацоўніцтвам унутры сектара і з іншымі стэйкхолдэрамі істотна адрознівалася ў Беларусі і асноўных краінах рэлакацыі АГС.

Абсалютная большасць інфраструктурных арганізацый і рэсурсных цэнтраў, якія прапануюць беларускім АГС тэхнічную дапамогу, навучанне і іншыя паслугі па развіцці патэнцыялу, знаходзяцца **за межамі Беларусі**. Такія паслугі аказваюць Беларуская рада культуры, Беларускі Дом правоў чалавека імя Барыса Звозскава, Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА», Міжнародны кансорцыум «ЕўраБеларусь», ОЕЕС і іншыя АГС. Хаця многія з гэтых арганізацый абслугоўваюць АГС і ўнутры Беларусі, і ў выгнанні, доступ да іх паслуг унутры краіны застаецца абмежаваным. У гарадах з вялікай беларускай дыяспарай, такіх як Варшава, Вільня, Тбілісі, Батумі, Беласток і Кракаў, існуюць каворкінг-прасторы для актывістаў і беларускіх АГС, пляцоўкі для правядзення мерапрыемстваў, трэнінгаў, кансультацый і нэтворкінгу. Адначасова **адсутнічаюць комплексныя і доўгатэрміновыя праграмы арганізацыйнага развіцця**, што наўпрост уплывае на арганізацыйны патэнцыял беларускіх АГС.

У 2023 годзе **беларускія АГС мелі доступ да шырокага спектру трэнінгаў і варкшопаў**. Некаторыя арганізацыі, такія як Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА», ОЕЕС, моладзевая арганізацыя «ІншыЯ» і Гётэ-Інстытут, прапаноўвалі больш працяглыя анлайн-курсы, якія часта суправаджаліся ментарствам, у галіне фандрэйзінгу, планавання, кіравання праектамі і камандамі,

інтэграцыі скразных каштоўнасцей у працу грамадскіх арганізацый і камунікацыі. Аднак **застаецца высокім попыт на дадатковую адукацыю па пытаннях кіравання арганізацыяй і рызыкамі, вырашэння канфліктаў і фінансавага мэнэджменту**. Як і ў 2022 годзе, АГС у Беларусі па-ранейшаму сутыкаліся з вострым недахопам вопытных трэнераў, фасілітатараў, кансультантаў па арганізацыйным развіцці і спецыялістаў па бяспецы, паколькі многія з іх пераехалі за мяжу ці ўвогуле сышлі з сектара АГС.

Цягам года такія арганізацыі, як Беларуская рада культуры, Беларускі Дом правоў чалавека, Фонд BYSOL і праект «Васьміног: адукацыя для беларускіх дзяцей сёння і заўтра», пераразмяркоўвалі сродкі, атрыманыя ад замежных донараў, арганізацыям грамадзянскай супольнасці ў Беларусі і за мяжой у рамках конкурсаў малых грантаў. Акрамя таго, яшчэ некалькі АГС займаліся рэгрантынгам без публічнага абвяшчэння аб правядзенні конкурса. У 2023 годзе анлайн-платформа «Новая Беларусь» запусціла праект лічбавага самакіравання пад назвай «Будуй сваё», які дазваляе беларусам Літвы і Польшчы ахвяраваць частку сваіх падаткаў пэўным арганізацыям, а затым вырашаць, якія беларускія праекты або ініцыятывы падтрымаць за кошт сабраных сродкаў. Больш за 265 чалавек ахвяравалі каля 47 000 еўра. З дапамогай пасрэдніцкіх АГС гэтыя сродкі выкарысталі для адкрыцця Беларускай бібліятэкі ў Вільні і стварэння вэб-сайта пра гісторыю Беларусі.

Хоць даследаванне, праведзенае Цэнтрам новых ідэй і Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі, паказала, што прадстаўнікі грамадскіх арганізацый мала ведаюць аб дзейнасці сваіх калег па сектары, рэлакаваныя беларускія АГС праводзілі сумесныя мерапрыемствы і ажыццяўлялі праекты, прасоўвалі агульныя парадкі дня і стваралі кааліцыі. У ліпені 2023 года больш за 20 СМІ, праваабарончых арганізацый і палітычных структур правялі марафон «Нам не ўсё адно!», сабраўшы больш за 574 000 еўра для беларускіх палітвязняў і іх сем'яў. У 2023 годзе з'явіўся шэраг новых тэматычных і геаграфічных аб'яднанняў АГС. Напрыклад, 30 кастрычніка беларускія эксперты, актывісты і грамадскія арганізацыі, якія займаюцца экалагічнымі пытаннямі, абвясцілі аб стварэнні альянсу «Зялёная Беларусь». У лістападзе дзевяць беларускіх АГС у Эстоніі аб'ядналіся ў нефармальную кааліцыю пад назвай «Асацыяцыя беларусаў Эстоніі», мэтай якой з'яўляецца ўмацаванне сувязей паміж беларускай дыяспарай і эстонскім грамадствам. Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой актыўна развівалася на працягу мінулага года, прыцягваючы новых членаў, аказваючы ім паслугі і наладжваючы адносіны з іншымі АГС.

Пры гэтым АГС, што працуюць у Беларусі, лічылі любое фармальнае супрацоўніцтва рызыкоўным і звычайна падтрымлівалі толькі мінімальнае нефармальнае ўзаемадзеянне, нават з даўнімі партнёрамі. У сувязі з гэтым разрыў паміж АГС унутры Беларусі і выгнанні пашыраўся.

Супрацоўніцтва паміж АГС і прадстаўнікамі бізнесу заставалася абмежаваным. Некаторыя арганізацыі, такія як Фонд BYSOL, актыўна развівалі адносі-

ны з прыватнымі кампаніямі і прадпрымальнікамі. Многія АГС працягвалі мэта накіравана адмаўляцца ад любога ўзаемадзеяння з цяперашнімі беларускімі ўладамі, але былі адзначаны выпадкі ўзаемадзеяння па палітычна неангажаваных пытаннях паміж арганізацыямі, якія легальна дзейнічаюць у Беларусі, і мясцовымі органамі ўлады.

Таксама беларускія АГС наладжвалі сувязі з дзяржаўнымі органамі, СМІ і мясцовымі арганізацыямі ў краінах рэлакацыі. Згодна з вынікамі апытання OEEC і Lawtrend, 49,1% арганізацый-рэспандэнтаў заявілі аб узаемадзеянні з АГС у краінах рэлакацыі, 21,8% — са СМІ, 18,2% — з цэнтральнымі органамі ўлады і 12,7% — з парламенцкімі органамі.

# ГРАМАДСКІ ІМІДЖ:
# 5.8 (2022: 5.7)




У 2023 годзе грамадскі імідж АГС нязначна пагоршыўся. Звычайная адкрытасць, сувязі з грамадскасцю і зносіны з урадам і бізнесам былі недаступныя большасці АГС у Беларусі. Інфармацыя пра дзейнасць АГС часта перадавалася толькі з вуснаў у вусны.

**З меркаванняў бяспекі празрыстасць АГС у Беларусі была блізкая да нуля.** Большасць АГС, у тым ліку ў выгнанні, дзейнічаюць таемна, не раскрываючы асоб і імён сваіх супрацоўнікаў і валанцёраў, або абмяжоўваюць сваю адкрытую дзейнасць адной ці дзвюма публічнымі асобамі. Такая ананімная камунікацыя перашкаджае ўсталяванню даверальных адносін з прыхільнікамі і падрывае надзейнасць АГС у вачах грамадскасці.

Некаторыя **АГС у выгнанні аднавілі выпуск публічных справаздач**. Беларускі Хельсінкскі камітэт, арганізацыя «ІншыЯ», Прававая ініцыятыва і іншыя

АГС штогод публікуюць адкрытыя справаздачы аб сваёй дзейнасці. Важнаадзначыць, што гэтыя **справаздачы не ўтрымліваюць інфармацыі аб фінансах або асобах**. АГС, якія ўключаюць фінансавую інфармацыю ў свае справаздачы, распаўсюджваюць такія дакументы толькі сярод сваіх партнёраў і донараў па закрытых, непублічных каналах.

АГС у Беларусі сутыкаюцца з моцным ціскам з боку грамадства, звязаным з патрабаваннем весці празрыстую і законную дзейнасць, але, на жаль, АГС не ў стане выканаць гэтыя чаканні з-за вышэйзгаданых рызык. ГОНГА або падобным лаяльным ураду арганізацыям, наадварот, значна прасцей прытрымлівацца гэтых патрабаванняў.

У 2023 годзе сярод рэспандэнтаў, якія пражываюць у Беларусі, было праведзена якаснае даследаванне пад назвай «Стаўленне беларусаў да грамадзянскай актыўнасці». Вынікі даследавання паказалі, што рэспандэнты агульна добра ставяцца да «грамадска карыснай дзейнасці» (г. зн. грамадзянскай актыўнасці), але ўспрымаюць такую дзейнасць як спосаб вырашэння мясцовых праблем або аказання адраснай дапамогі людзям, якія аказаліся ў бядзе, а не як магчымасць палепшыць сітуацыю ў краіне або выкарыстаць такую дзейнасць у мэтах асабістага развіцця. Большасць рэспандэнтаў былі слаба інфармаваныя аб дзейнасці АГС і не праводзілі выразнага адрознення паміж незалежнымі арганізацыямі і створанымі дзяржавай НДА. Толькі невялікая частка рэспандэнтаў згадала, што апошнім часам яны ўдзельнічалі ў грамадска карысных мерапрыемствах, такіх як уступленне ў валанцёрскія групы, дапамога бяздомным жывёлам, ахвяраванні грошай або рэчаў на дабрачыннасць або ўдзел у суботніках. Гэта паказвае агульны **нізкі ўзровень разумення насельніцтвам сектара АГС**.

Паводле «Народнага апытання» (у якім удзельнічалі толькі дэмакратычна арыентаваныя актывісты, але ў тым ліку тыя, якія пражываюць у Беларусі), рэспандэнты добра інфармаваныя пра шматлікія новыя АГС і лічаць іх карыснымі. **Найбольш пазнавальнымі сталі АГС, якія не адмаўляюць метады гвалтоўнага супраціву.** 90% рэспандэнтаў ведалі Кіберпартызанаў, 81% лічылі іх карыснымі, ByPol была вядомая 87%, і ёй давяралі 56% адпаведна, а ініцыятыва «Беларускі гаюн» была вядомая 73% і карысталася даверам 66% рэспандэнтаў. Праваабарончыя арганізацыі, якія аказваюць падтрымку палітычным зняволеным і іх сем'ям, у першую чаргу BYSOL і Politzek.me, таксама былі добра вядомымі прадэмакратычна настроеным беларусам і карысталіся іх даверам.

АГС, якія легальна працуюць у Беларусі, вымушаны ў той ці іншай форме супрацоўнічаць з дзяржавай, напрыклад, праводзіць свае мерапрыемствы ў дзяржаўных установах культуры і адукацыі. Праз гэта расце залежнасць АГС ад дзяржавы, якая ўскладняе правядзенне мяжы паміж арганізацыямі, якія не бачаць праблемы ў супрацоўніцтве з дзяржавай, і ініцыятывамі, што добра маскіруюцца пад лаяльныя. У такім аўтарытарным кантэксце АГС пастаянна сутыкаюцца з неабходнасцю прыняцця рашэнняў аб тым, на якія саступкі яны павінны пайсці, каб выжыць, і як захаваць важныя адрозненні паміж сабой і ГОНГА.

У 2023 годзе ўлады працягнулі сваю мэтанакіраваную кампанію па дыскрэдытацыі АГС і абясцэньванні іх дзейнасці праз дзяржаўныя СМІ і прапагандысцкія Telegram-каналы. Праект FactcheckBY, які аналізуе дэзынфармацыю аб грамадзянскай супольнасці ў беларускіх дзяржаўных медыя і беларускай службе расійскага інфармацыйнага агенцтва Sputnik, толькі за снежань зафіксаваў 91 публікацыю, скіраваную на дыскрэдытацыю грамадзянскай супольнасці. Прапагандысты не адмаўлялі, што мэтанакіравана знішчаюць АГС, называючы іх «псеўдасацыяльнымі структурамі, квазіпартыямі і рупарамі экстрэмісцкай прапаганды, якія ўносяць хаос і разлад у грамадства». Афіцыйныя асобы таксама прызналі, што ў цяперашні час рэжым імкнецца надаць тэрміну «грамадзянская супольнасць» новае значэнне, замяняючы АГС на ГОНГА.

Такія прапагандысцкія матэрыялы дэманізуюць АГС, поўняцца тэорыямі змовы і распаўсюджваюць дэзынфармацыю з мэтай дыскрэдытацыі легітымных дзеянняў грамадзянскай супольнасці. Адна з такіх тэорый змовы тычылася падтрымкі АГС Еўрасаюзам, якую назвалі «умяшаннем» ва ўнутраныя справы Беларусі. Дзяржаўная прапаганда таксама імкнулася дыскрэдытаваць зняволеных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, такіх як нобелеўскі лаўрэат Алесь Бяляцкі, з мэтай падарваць іх рэпутацыю і апраўдаць пераслед.

Пры гэтым адсутнічаюць дакладныя дадзеныя, якія б сведчылі аб шырокай папулярнасці падобных прапагандысцкіх матэрыялаў. Прадстаўнікі АГС лічаць, што такая прапаганда не робіць ураджанне на грамадскасць за межамі кола прыхільнікаў рэжыму і ў значнай ступені з'яўляецца нерэлевантнай для палітычна нейтральнай аўдыторыі.

Тым не менш, рэгулярнае і шырока распаўсюджанае прызнанне АГС, іх інфармацыйных каналаў і СМІ «экстрэмісцкімі» выклікае дастаткова страху ў іх мэтавых аўдыторый, каб адвадзіць іх ад узаемадзеяння з меркавана экстрэмісцкім кантэнтам праз падпіску, рэакцыі, каментары або распаўсюджванне. АГС, прызнаныя «экстрэмісцкімі», а таксама незалежныя СМІ былі вымушаныя прапанаваць жыхарам Беларусі адпісацца ад іх старонак у сацыяльных сетках з меркаванняў бяспекі, што наўпрост абмежавала доступ АГС да іх аўдыторыі і падарвала намаганні АГС па стварэнні станоўчага грамадскага іміджу.

АГС, якія дзейнічаюць з-за мяжы, праводзілі актыўныя камунікацыйныя кампаніі. Дзейнасць такіх АГС як Праваабарончы цэнтр «Вясна» або Беларускі моладзевы хаб, рэгулярна асвятлялася СМІ, якія працуюць у выгнанні і ў Беларусі прызнаныя экстрэмісцкімі. СМІ атрымлівалі каментары ад прадстаўнікоў АГС, распаўсюджвалі вынікі даследаванняў і ахвотна публікавалі аналітычныя дакументы, такія як матэрыялы праекта «Кошт урада». У той жа час іншыя АГС наракалі на тое, што СМІ ігнаруюць іх тэмы і актыўнасці, асабліва скіраваныя на сацыяльную інтэграцыю або абарону правоў уразлівых груп.

Асобныя АГС маюць этычныя кодэксы для сваіх супрацоўнікаў і сяброў, але ў 2023 годзе АГС не спрабавалі распрацаваць агульны кодэкс паводзінаў для ўсяго сектара.